УДК 792.06:7.011.2

# Праблемы развіцця тэатральнай сацыялогіі

**Бузук Р. Л.**

*Установа адукацыі "Беларускі дзяржаўныўніверсітэт культуры і мастацтваў",*



*Мінск*

*Аўтар разглядае проблему тэатральнай сацыялогіі, якая знаходзіцца на стыку дзвюх навук - сацыялогіі і тэатразнаўства. Яна часткова ўваходзіць у сацыялогію як галіна сацыялогіі мастацтва і, у больш шырокім сэнсе, сацыялогіі культуры. Сацыялогія ж культуры - гэта навука аб функцыянаванні культурыў грамадстве, ці, інакш кажучы, аб культурным жыцці грамадства. Такім чынам, пра сацыялогію тэатра можна сказаць, шта яе прадметам з'яўляецца функцыянаванне тэатральнай культуры ў канкрэтных сацыяльна-гістарычных умовах. Прадмет тэатральнай сацыялогіі ляжыць перш заўсёў галіне грамадскага быцця тэатральнага мастацтва, у сферы форм я го існавання,у патрэбах, якія выклікаюць яго ўзнікненне, у тых праявах, у якіх яна рэалізуецца, у адносінах і грамадскіх групах, што ўтвараюцца на яго основе, і, норэшце, у функцыях і каштоўнасцях, якія яна (сацыялогія), адпаведна, выконвае і стварае. Сацыялогія тэатра (тэатральная сацыялогія)у шырокім сэнсе слова можа быць вызначана як навука абуздзеянні тэатра на грамадства і адлюстраванні гэтага ўздзеяння ў тэатральнай творчасці, ці, інакш кажучы, аб заканамернасцях узаемадзеяння тэатра і грамадства ў рамках сацыяльнага фунцыянавання сцэнічнага мастацтва.*

***Ключавыя словы:*** *сацыялогія тэатра, грамадскія каштоўнасці сцэнічнага мастацтва, заканамернасціўздзеяння тэатра на гледача, сацыяльнае функцыянаванне тэатра.*

(Искусство и культура. — 2012. — № 2(6). — С. 34-38)

# **Issues of the development of theater** sociology

**Buzuk R. L.**

*Educational establishment "Belarusian State University of Culture and Arts", Minsk*

*The author considers the issue of theater sociology which is on the juncture of two sciences sociology and theater studies. It partly belongs to sociology as a branch of sociology of art and, in a broader sense, to sociology of culture. Sociology of culture is a science of culture functioning in the society or, in other words, of the cultural life of the society. So, the subject of sociology of theater can be identified as functioning of theater culture in definite social and historical environment. The subject of theater sociology is first of all in the sphere of public existence of theatrical art, in the sphere of the forms of its existence, in the needs which call for its emergence, in the phenomena of its implementation, in the relations and public groups, which are made up on its basis, and, finally, in the implemented functions and values. Sociology of theater (theater sociology) in a broad sense can be defined as a science of the impact of the theater on society and reflection of this impact in theater art, or, in other words, of the laws of the interaction of the theater and the society within social functioning of theatrical art.*

***Key words:*** *theater sociology, public values of theatrical art, laws of the influence of the theater on the spectator, social functioning of the theater.*

(Art and Culture. — 2012. — № 2(6). — P. 34-38)

Сацыялогія тэатра ўключае дзве вялікія групы праблем. Адну можна назваць тэатральнымі праблемамі сацыялогіі. Да іх лалежаць, напрыклад, такія, як агульныя заканамернасці функцыянавання тэатральных культур і іх гістарычная тыпалогія: структура і формы тэатральнага жыцця грамадства, у тым ліку тэатральны побыт розных сацыяльных груп, іх дзейнасць у адносінах да тэатра (тэа тральныя паводзіны); асаблівасці тэатральнай камунікацыі (г. зн. распаўсюджвання і ўспрымання спектакля) у розных сацыяльных і тэхнічных умовах; сацыяльныя функцыі тэатра і формы іх ажыццяўлення; умовы і фактары фарміравання тэатральных патрэбнасцей і інтарэсаў грамадства ў цэлым і асобных сацыяльных груп, іх тэатральныя запыты, установкі, ідэалы, нормы, густы, ацэнкі і іншыя формы тэа-

*Адрес для корреспонденции: e-mail:* kaftheatr@buk.by - **Р. Л. Бузук**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тральнай свядомасці; тыпалогія і структура тэатральнай публікі і ўваходзячых у яе груп слухачоў; заканамернасці грамадскага засваення прадуктаў тэатральнай творчасці і сатворчасці, іх даступнасці і папулярнасці.

Другая група - сацыялагічныя праблемы тэатразнаўства. Тут гаворка ідзе аб тым, як сацыяльнае функцыянаванне тэатра адлюстроўваецца ў яго змесце і форме, у самім існаванні тэатральнай творчасці і сцэнічнага мастацтва, як звязаны з грамадскім успрыманнем і бытаваннем тэатра такія яго складнікі, як драматургія, рэжысёрскае майстэрства, акцёрская трактоўка ролі і інш.

Мэта артыкула - выяўленне адрознення тэатральнай сацыялогіі ад сацыяльнай гісторыі і сацыяльнай тэорыі тэатра.

Адрозненне заключаецца ў тым, што гісторыя і тэорыя тэатральнага мастацтва абмяжоўваюцца вывучэннем тэатра як такога, г. зн. таго, што пастаўлена на сцэне, а сацыялогія цікавіцца далейшым жыццём тэатральнай пастаноўкі ў грамадстве, г. зн. яе распаўсюджваннем і ўспрыманнем. Гісторыя і тэорыя тэатра займаюцца тэатральнымі пастаноўкамі ад моманту іх зараджэння ў свядомасці аўтараў да паказу на сцэне, даследуючы, як пэўныя грамадскія ўмовы стымулявалі з'яўленне таго ці іншага спектакля і адлюстраваліся ў яго ідэях, сцэнічныхвобразах, эстэтычным, мастацкім і эмацыянальным змесце.

**Лёс спектакля як прадмет тэатральнай сацыялогіі.** Тэатральная сацыялогія займаецца лёсам спектакля пасля таго, як адбыўся яго паказ на сцэне тэатра і ён пачаў функцыянаваць у грамадстве. Што ж датычыць рэжысёрскай творчасці, акцёрскага майстэрства і г. д., то яны таксама цікавяць сацыялогію тэатра, але толькі ў вызначаным аспекце, з пункту гледжання таго, як ажыццяўляецца зваротная сувязь паміж грамадскім "спажываннем" спектакля і яго стварэннем. Пры гэтым паспяховае, плённае раскрыццё дадзенай сувязі магчыма не толькі ў адносінах да тыповай, стандартнай "масавай" тэатральнай прадукцыі, але і ў адносінах да ўнікальных мастацка і грамадска значных спектакляў.

Такім чынам, сацыялагічны падыход да даследавання тэатра можа разумецца як у шырокім, так і ў вузкім сэнсе. У першым выпадку ён заключаецца ў разглядзе ўсіх аспектаў узаемаадносін мастацтва з грамадствам, уключаючы адлюстраванне працэсаў грамадскага жыцця непасрэдна ў самім змесце тэатральных пастановак. У вузкім сэнсе сацыялагічны падыход да тэатральнага мастацтва азначае даследаванне ва ўзаемасувязі з працэсамі яго сацыяльнага функцыянавання. У гэтым выпадку тэатразнаўства збліжаецца з найбольш роднаснай яму з усіх галіновых сацыялогій - сацыялогіяй тэатра, якая вывучае яго функцыянаванне і развіццё ў грамадстве.

**Структура сацыялогіі тэатра.** Аб'ёмнасць і шматграннасць прадмета тэатральнай сацыялогіі абумоўлівае складанасць яе ўнутранай структуры.

Па-першае, гэтая навука падзяляецца на раздзелы, якія адпавядаюць розным сферам тэатральнай жыццядзейнасці грамадства, г. зн. на сацыялогію прафесійнага і аматарскага тэатра, а таксама тэатральнай адукацыі, сродкаў распаўсюджвання сцэнічнага мастацтва, успрымання і г. д. Пры гэтым, аднак, неабходна памятаць, што прапанаваны падзел сацыялогіі тэатра на раздзелы з'яўляецца даволі ўмоўным, таксама як і размежаванне з'яў, якія яны адлюстроўваюць у самой рэчаіснасці.

Па-другое, у кожным з раздзелаў, а значыць і ў тэатральнай сацыялогіі ў цэлым, зыходзячы з храналагічнага прынцыпу вылучаюць дзве вялікія групы праблем: тыя, якія належаць да мінулага, і тыя, якія адносяцца да нашых дзён. Адпаведна, можна асобна казаць (таксама ўмоўна) аб сацыялагічнай гісторыі тэатральнагажыцця грамадства і аб сацыялогіі сучаснага тэатральнага жыцця.

Па-трэцяе, у залежнасці ад ступені абагульнення матэрыялу і абстрактнасці вынікаў у тэатральнай сацыялогіі, як і ў любой навуцы, выдзяляюць два асноўныя ўзроўні: эмпірычны (дакладней кажучы, узровень методыкі эмпірычных, г. зн. канкрэтна-сацыялагічных даследаванняў) і тэарэтычны. Першы звязаны са зборам і першасным асэнсаваннем фактаў другі - з распрацоўкай абагульняючых канцэпцый.

У выніку распаўсюджвання мастацтва (у тым ліку і тэатральнага) і яго ўкаранення ўштодзённаежыццё надзвычай узмацнілася зваротнае ўздзеянне на творчасць грамадскага ўспрымання. Тэатральныя рэжысёры і акцёры не могуць сёння не лічыцца з тым, што іх гледачы маюць вопыт зносін не толькі з тэатрам, але і з кінематографам, тэлебачаннем,усялякімі масавымі відовішчамі (у тым ліку спартыўныя), і, сустракаючыся з публікай на спектаклі, яны павінны ўлічваць тыя асаблівасці ўспрымання гледача, якія абумоўлены гэтым вопытам.

Усе гэтыя і многія іншыя абставіны адлюстроўваюцца ў змесце і структуры саміх мастацкіх твораў, і таму іх уплыў на творчасць падлягае мастацтвазнаўчаму аналізу. Аднак традыцыйныя метады такога аналізу, якія склаліся ў "датэлевізійную" эпоху, не арыентаваны на раскрыццё новых заканамернасцей. І тут мастацтвазнаўству непазбежна даводзіцца разлічваць на дапамогу сацыялогіі мастацтва. Асабліва ўзрастае патрэба ў саюзе з ёй тады, калі даследуюцца масавыя



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

жанры мастацтва, разлічаныя на найбольш шырокае, усеагульнаераспаўсюджванне і бытаванне. Вывучаць іх толькі як чыста мастацкія з'явы, толькі з пазіцый традыцыйнага мастацтвазнаўства, ігнаруючы іх сацыяльнае прызначэнне і ўмовы агульнага функцыянавання, - значыць выпусціць з-пад увагі нешта вельмі важнае, характэрнае, спецыфічнае.

У гэтых выпадках валоданне даследчыкам сацыялагічным падыходам (не як заменай ім мастацтвазнаўчага, а як неабходным дадаткам да яго] становіцца ўжо не проста пажаданым, але і абавязковым.

**Роля сацыялогіі тэатра.** Масавыя жанры сёння актыўна ўзаемадзейнічаюць з усімі астатнімі, відазмяняючы іх воблік. Дастаткова прыгадаць нават пранікненне сродкаў эстрады ўдраматычны тэатр. Ды і многія "не масавыя" творы сёння ўцягнуты ў сістэму тыражавання і трансляцыі: самыя камерныя спектаклі, напрыклад, перадаюцца па тэлебачанні. Таму падыход да сцэнічнага мастацтва з боку тэатральнай сацыялогіі на сённяшні дзень уяўляецца надзвычай прыдатным і неабходным пры даследаванні практычна любых мастацкіх з'яў.

Увогуле зразумела, што роля сацыялогіі тэатра яшчэ больш узрастае, калі мы выходзім за межы тэатральнай творчасці і звяртаемся да вывучэння астатніх "блокаў" тэатральнай культуры і тэатральнага жыцця, асабліва - распаўсюджвання і ўспрымання сцэнічнага мастацтва. Аднак гэта зусім не азначае, што ўласна тэатразнаўству ў традыцыйным яго разуменні тут няма чаго рабіць. Відавочна, што і адна тэатральная сацыялогія практычна не ў стане ўсебакова забяспечыць вырашэнне ўсіх даследчыцкіх задач, што паўстаюць у дадзенай галіне. Што адбываецца са спектаклем на шляху ад аўтараў да публікі? Як ён змяняецца, праходзячы па розных каналах камунікацый? Ад якіх мастацкіх якасцей тэатральнай пастаноўкі залежаць яе ўспрыманне тымі ці іншымі групамі гледачоў, яе ўздзеянне на іх, яе папулярнасць у грамадстве, працягласць яе сацыяльнага бытавання? Што такое паўнацэннае, па-сапраўднаму мастацкае ўспрыманне тэатра, якія яго крытэрыі і прыметы? Адказаць на гэтыя і іншыя важныя пытанні немагчыма без дапамогі тэатразнаўства, без выкарыстання яго метадаў.

І ўсё-такі на пярэдні план пры вывучэнні жыцця тэатра ў грамадстве непазбежна выходзіць сацыялогія. Менавіта яе метады дазваляюць даведацца, па якіх каналах даходзяць спектаклі да розных груп публікі, якую ацэнку яны атрымліваюць, наколькі шырокай і працяглай папулярнасцю карыстаюцца ў тым ці іншым асяроддзі. Гэтыя звесткі цікавыя не толькі самі па сабе - яны неабходныя сацыялагічна арыентаванаму тэатразнаўству, каб даследаваць зваротную сувязь і залежнасць паміж сацыяльным функцыянаваннем сцэнічнага мастацтва і творчасцю, каб выявіць, як уздзейнічае на змест і форму тэатральнага мастацтва яго ўспрыманне і бытаванне ў грамадстве. Атрымаць дастаткова дакладныя звесткі такога кшталту нялёгка, для гэтага неабходна валодаць методыкай сацыялагічнага даследавання. Сацыялагічны дылетантызм (якім часам грашаць асобныя апытанні, што праводзяцца тэатразнаўцамі без неабходнай падрыхтоўкі) гэтаксама недапушчальны, як і мастацтвазнаўчы (які праяўляюць часам сацыёлагі, звяртаючыся да вывучэння тэатральных з'яў без належнага ведання і ўліку іх спецыфікі). Таму актуальнымі задачам! ў сферы даследавання тэатральнай дзейнасці застаюцца засваенне тэатразнаўцамі сацыялагічнай методыкі (што патрабуе пэўных намаганняў, але дасягаецца значна лягчэй, чым авалоданне мастацтвазнаўчай методыкай сацыёлагамі) і іх садружнасць са спецыялістамі па прыкладной сацыялогіі. Усе звёны тэатральнай культуры, узятыя паасобку, і ўсе яе віды патрабуюць сёння комплекснага вывучэння з абавязковым аб'яднаннем метадаў тэатразнаўства і сацыялогіі тэатра.

**Фарміраванне апарату сацыялогіі тэатра.** Для эфектыўнага вырашэння ўсіх сваіх задач тэатральная сацыялогія абавязана абапірацца на дастаткова распрацаваны метадалагічны апарат. Пры гэтым яна мае права выкарыстоўваць як уласныя спецыяльныя спосабы даследавання, так і прыдатныя для яе метады іншых навуковых напрамкаў.

Паколькі сацыялогія тэатра вылучылася ў якасці самастойнай дысцыпліны параўнальна нядаўна, **фарміраванне яе спецыяльнай метадалогіі і методыкі** яшчэ толькі пачынаецца. Таму сёння размежаванне метадаў, якія яна ўжывае, на "свае" і "чужыя" было б залішне паспешлівым. Зараз ў тэарэтычных і эмпірычных даследаваннях, прысвечаных тэатру і яго функцыянаванню, праходзяць выпрабаванне самыя розныя метады збору, апрацоўкі сацыялагічнай інфармацыі, аналізу тэатральнай творчасці, рэпертуару тэатра, успрымання спектакляў. **Яны атрыманы, з аднаго боку, з прыкладной сацыялогіі і сацыяльнай псіхалогіі, а з другога - з тэатразнаўства.** Метадалогія тэатральнай сацыялогіі заснавана на трансфармацыі і развіцці ўсіх гэтых метадаў у адпаведнасці са спецыфікай яе прадмета на аснове сінтэзу тэатразнаўства і сацыялогіі.

Такім чынам, узнікае шэраг важных метадалагічных праблем, якія патрабуюць і тэарэтычнага асэнсавання, і практычнага вырашэння.



РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Па-першае, неабходна шукаць такія шляхі і спосабы сацыялагічнага даследавання тэатра, якія забяспечваюць спалучэнне навуковай аб'ектыўнасці з адэкватным адлюстраваннем асаблівай прыроды тэатра як мастацтва. Вядома, што сацыялогію наогул як навуку цікавяць перш за ўсё тыя ўласцівасці і заканамернасці грамадскіх працэсаў, што належаць да ліку аб'ектыўных. А вось стварэнне тэатральных твораў і іх успрыманне належаць да суб'ектыўных актаў. Яны, зразумела, падпарадкоўваюцца пэўным аб'ектыўным законам, Але і змест, і форма гэтых працэсаў, як і іх вынікаў, г. зн.
тэатральных пастановак і іх адлюстравання ў свядомасці гледачоў, у вялікай ступені абумоўлены ўласцівасцямі іх суб'ектаў, воляй і свядомасцю людзей.

Вось чаму сацыялогія тэатра так настойліва спрабуе паставіць сабе на службу розныя метады сацыяльнай псіхалогіі (а часткова і агульнай псіхалогіі). Іх магчымасці не павінны абсалютызавацца, таму што залішняя псіхалагізацыя сацыялогіі тэатра можа перашкодзіць раскрыццю дэтэрмінаванасці вывучаемых ёю з'яў. Але адмежавацца ад сацыяльна- псіхалагічных метадаў, выключыць іх з арсенала даследчыкаў тэатральнага жыцця грамадства было б таксама памылковым, таму што без вывучэння ўспрымання тэатральнага мастацтва на сацыялагічным узроўні мы не здолеем пранікнуць у сутнасць гэтай з'явы, бо кожны чалавек, успрымаючы спектакль, дзейнічае не толькі як біялагічная істота ці індывідуум у псіхалагічным сэнсе, але і, у першую чаргу, як асоба, г. зн. як "сукупнасць інтэграваных у іх сацыяльна-значных рыс, утвораных у працэсе непасрэднага і ўскоснага ўзаемадзеяння дадзенай асобы з іншымі людзьмі.

Па-другое, значныя цяжкасці ўзнікаюць з-за таго, што агульная сацыялогія ў прынцыпе мае справу з масавымі з'явамі, што ўтараюцца, і яе метады прыстасаваны менавіта для даследавання такога матэрыялу, які лёгка паддаецца статыстычнай апрацоўцы. Сацыялогія ж мастацтва хаця і звяртаецца часткова да падобнага матэрыялу, тым не менш не мае права забываць, што сапраўдныя мастацкія каштоўнасці - у сферы творчасці і ўспрымання - індывідуальныя, непаўторныя, унікальныя. Гэтая акалічнасць нярэдка вылучаецца ў якасці доказу супраць сацыялагічнага падыходу да мастацтва ўвогуле.

Аднак сацыялогія тэатра не павінна адмаўляцца ад даследавання масавых з'яў тэатральнага жыцця - нават таму, што яны рэальна існуюць і з кожным годам, па меры развіцця масавых камунікацый і новых сродкаў тыражавання тэатральнага мастацтва, іграюць усё больш значную ролю. Апрача таго, выявіць у поўнай меры арыгінальнасць мастацкай з'явы, непадобнай да астатніх, магчыма толькі пры ўмове, што вызначаны той стэрэатып, ад якога яна адхіляецца. Відавочна, што неабходна шукаць і ўдасканальваць метады, якія дазваляюць не толькі дакладна адрозніваць у тэатральнай культуры масавае і індывідуальнае, але і вызначыць іх суадносіны, узаемасувязь і ўзаемадзеянне (напрыклад, бачыць, як нават у самым, як падаецца, індывідуальным па характары, унікальным сцэнічным творы адлюстраваны хаця бы некаторыя рысы масавай свядомасці, таму што ў адваротным выпадку ён не мог быць успрынятым і функцыянаваць у грамадстве).

Па-трэцяе, тэатральная творчасць і яе ўспрыманне, падобна да іншых духоўных з'яў (але - з прычыны сваёй спецыфікі - яшчэ ў большой ступені), патрабуюць не толькі колькасных паказчыкаў. Напрыклад, колькасць паказаў спектакляў або колькасць іх гледачоў яшчэ нічога не гаворыць пра дасягненні ці недахопы, як і ўвогуле пра істотныя асаблівасці сцэнічнага мастацтва ці яго ўспрымання.

Між тым методыка канкрэтна-сацыялагічных даследаванняў арыентавана на атрыманне менавіта падобных паказчыкаў. Гэта служыць дастатковым аргументам на карысць выпрацоўкі сацыялогіяй тэатра ўласных метадаў, якія здольныя раскрыць якасны бок тэатральнай дзейнасці і яе вынікаў.

Па-чацвёртае, сацыялогія тэатра імкнецца не толькі пазнаваць з'явы тэатральнай культуры, але і падыходзіць да іх з пэўных аксіялагічных пазіцый. У сувязі з гэтым тэатральнай сацыялогіі неабходна распрацаваць адпаведныя метады вызначэння аб'ектыўнай грамадскай каштоўнасці тых з'яў, якія яна даследуе.

Па-пятае, сацыялогія тэатра можа і павінна выкарыстоўваць у сваіх мэтах асобныя метады тэатразнаўчага аналізу. Без гэтага немагчыма навукова ацэньваць і тлумачыць атрыманыя вынікі.

Метады аналізу, якія ўжываюцца сёння пры правядзенні даследаванняў тэатра, разнастайныя. Некаторыя з іх уласцівыя сацыялогіі ў цэлым - напрыклад, метад "кантэнт-аналізу" крыніц (раздрабленне іх зместу на асобныя значныя элементы, падлік колькасці элементаў кожнага віду ва ўсёй сукупнасці крыніц і выяўленне таго, як суадносяцца паміж сабой ў гэтай сукупнасці розныя віды элемантаў).

Тэатральнай сацыялогіі ўласцівы і колькасныя метады - метады вымярэння і матэматычнай апрацоўкі фактычнай інфармацыі, агульныя для ўсіх сацыялагічных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

дысцыплін і фактычна запазычаныя імі са статыстыкі. Галіну навукі, якая займаецца падобнай апрацоўкай эмпірычнага тэатральна-сацыялагічнага матэрыялу, можна назваць тэатральнай статыстыкай.

І збіранне, і ўпарадкаванне такога матэрыялу - справа даволі працаёмкая і вельмі адказная, якая патрабуе валодання спецыяльнымі ведамі па методыцы канкрэтна-сацыялагічных даследаванняў і практычных навыкаўу гэтай галіне. Напрыклад, для правядзення масавага пісьмовага апытання неабходна правільна скласці праграму даследавання, вызначыць яго аб'ект (правесці выбарку), распрацаваць анкету, правесці "пілотнае" (пробнае) анкетаванне і толькі пасля таго - асноўнае, пісьменна (у статыстычным сэнсе) апрацаваць атрыманыя звесткі. Інакш нельга атрымаць дакладныя і прытым найноўшыя - г. зн. сапраўды каштоўныя звесткі.

**Заключэнне.** Тэатральна-сацыялагічныя даследаванні ўсіх узроўняў могуць быць паспяховымі толькі ў тым выпадку, калі яны ажыццяўляюцца як комплексныя, аб'яднанымі сіламі прадстаўнікоў не менш як дзвюх навук (сацыялогіі, тэатразнаўства) ці такімі спецыялістамі, якія спалучаюць абедзве навукі ў адной асобе. Тады тэатральная сацыялогія здолее не толькі плённа выкарыстоўваць дасягненні сумежных навуковых дысцыплін, але і, у сваю чаргу, узбагаціць іх новымі каштоўнымі метадамі даследавання і тэарэтычнымі высновамі.

## ЛІТАРАТУРА

1. Кон, И. С. Социология личности / И. С. Кон. - М.: Политиздат, 1967. - 383 с.

*Паступіў у рэдакцыю 6.01.2012 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ